# Святло праз стагоддзі



1

**Знайсці натхненне ў багатай мінуўшчыне і нашай гісторыка-культурнай спадчыне — у Літаратурным музеі Максіма Багдановіча працуе выстава "Старая Беларусь: ззянне роднага краю".**

Аўтарка экспанаваных работ — Марыя Каралёва — скончыла Мінскую дзяржаўную гімназію-каледж мастацтваў па спецыяльнасці "мастак-дызайнер" у 2010 годзе, а ў 2015-м — Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў па спецыяльнасці "кампаратыўнае мастацтвазнаўства", у 2016 годзе атрымала ступень магістра. Дзяўчына даўно цікавіцца беларускай гісторыяй і культурай, займаецца краязнаўствам, ладзіла аўтарскія экскурсіі па сталіцы, доўгі час працавала ў Музеі гісторыі горада Мінска. Таму не дзіўна, што натхненне для сваіх твораў мастачка знаходзіць найперш у багатай мінуўшчыне нашай краіны і яе гісторыка-культурнай спадчыне. У выніку з'явіліся серыі "Мінск. Горад і сонца", "Страчаны Мінск" і "Нябачная Беларусь", прысвечаныя архітэктурным помнікам нашай краіны — як існым, так і зруйнаваным. Дзякуючы змешчанаму ў экспазіцыі QR-коду можна таксама азнаёміцца з кароткай гісторыяй будынкаў, выяўленых на карцінах.

## ХРАМЫ І ПАЛАЦЫ

З ліку страчаных помнікаў на выставе можна пабачыць выявы кальвінскіх збораў у Асташыне Карэліцкага раёна і Дзяржынску, касцёлаў Святога Францыска Ксаверыя ў Магілёве, Святога Станіслава ў Маляцічах ля Магілёва і ў Пінску, палацаў Абуховічаў у Святычах Ляхавіцкага раёна, Радзівілаў у Манькавічах на Століншчыне, Сапегаў у Дзярэчыне на Зэльвеншчыне, Слізеняў у Навадзявяткавічах на Слонімшчыне і Касакоўскіх у Вялікай Бераставіцы, а таксама такіх зніклых мінскіх славутасцяў, як касцёл Святога Тамаша Аквінскага на сучаснай Кастрычніцкай плошчы, школьны двор ля Халоднай сінагогі на Нямізе, старая мячэць, што стаяла насупраць Палаца спорту, палац Гаўсмана ля Аляксандраўскага сквера і забудова на месцы цяперашняй плошчы Незалежнасці.

Асобную серыю складаюць выявы страчаных помнікаў драўлянага дойлідства, такіх як цэрквы Святога Ільі і Святой Тройцы ў Віцебску, Пакрова Найсвяцейшай Багародзіцы ў Вейне на Сенненшчыне, Святой Варвары ў Слуцку, Святой Тройцы ў Талі і Свята-Прачысценскай ва Урэччы на Любаншчыне, касцёлы Святой Тэрэзы ў Астрыне на Шчучыншчыне, Святых Пятра і Паўла ў Слабодцы на Браслаўшчыне і Святога Арханёла Міхаіла ў Цімкавічах на Капыльшчыне, сінагогі ў Воўпе Ваўкавыскага раёна і Нароўлі, сядзіба Цітовых у Смальянах на Аршаншчыне і лямус у Сапоцкіне ля Гродна.



2

## ТЭХНІКА ПРАЗРЫСТАСЦІ

Лёгкасць акварэлі дазваляе стварыць у гледача адпаведнае тэме ўражанне хуткаплыннасці часу і зменлівасці краявіду, з якога зніклі выяўленыя помнікі: драўляныя і мураваныя храмы, сінагогі, мячэці, сядзібы, гарадская забудова. У выпадку, калі стаіць задача рэканструяваць вобраз страчанага помніка, аднаўляць рэальнасць асабліва цікава, але і больш складана. Мастачка прызнаецца, што, прывыкшы маляваць на пленэрах з натуры, не надта лёгка магла пераключыцца на стварэнне каляровых вобразаў будынкаў, ад якіх не захавалася ні цагліны, а выгляд іх вядомы толькі па выявах, і тое найчасцей чорна-белых.



3

Частка твораў напісаная ў тэхніцы акварэлі па мокрым, для якой выкарыстоўваецца баваўняная папера, што ўвільгатняецца з абодвух бакоў. Каб аркуш быў роўны, без хваляў, непасрэдна перад маляваннем яго яшчэ раз увільгатняюць мокрым пэндзлем. Такая акварэль пішацца ў адзін этап, пакуль аркуш застаецца максімальна вільготным, што дазваляе ствараць мяккія пераходы паміж колерамі, а месцы, дзе трэба выявіць дакладныя межы аб'ектаў, прамакаюць сурвэткай.



4

## ПА СЛЯДАХ ПАЭТА

Асобную частку экспазіцыі складае серыя свяцільняў, якія не толькі з'яўляюцца мастацкімі творамі, але могуць выкарыстоўвацца як сродак асвятлення інтэр'еру. Сілуэты помнікаў, выразаныя з некалькіх пластоў паперы і змешчаныя за шклом у драўляных рамках, падсвечаныя лямпачкамі, нагадваюць тэатральныя дэкарацыі і ствараюць надзвычай утульную атмасферу. На выставе ў музеі Максіма Багдановіча сабраныя свяцільні з вобразамі цэлага шэрагу помнікаў Гродна, дзе прайшлі першыя гады жыцця паэта. Тут можна пабачыць выявы яго дома-музея на Новым Свеце, Каложскай царквы, дома рамесніка на вуліцы Элізы Ажэшкі, касцёла Дабравешчання Найсвяцейшай Дзевы Марыі і кафедральнага касцёла Святога Францішка Ксаверыя.

Шэраг краявідаў нагадвае аб візіце Максіма Багдановіча ў Вільню — тут і Вострая Брама са славутым абразом Божай Маці, і касцёл Святой Ганны, апетыя паэтам у вершах. Акрамя таго, прадстаўленыя на выставе свяцільні з відарысамі касцёла Маці Божай Ружанцовай у Солах на Смаргоншчыне, касцёла Унебаўзяцця Найсвяцейшай Дзевы Марыі ў Красным, што ля Маладзечна, царквы Раства Багародзіцы ў прысталічным Сёмкавым Гарадку, а таксама мінскіх сабора Святых Пятра і Паўла, касцёла Святых Сымона і Алены, плошчы Свабоды і панарамы Верхняга горада. Выстава працуе да 16 сакавіка.

**Антон РУДАК**
Фота Уладзіміра ШЛАПАКА



5

Экспанаваныя работы:
1. Смаляны. Сядзіба Цітовых.
2. Койданаў. Кальвінскі збор.
3. Беразвечча. Петрапаўлаўская царква.
4. Пінск. Касцёл езуітаў.
5. Манькавічы. Палац Радзівілаў.